жыцьцё

Уладзімір Міхно



...Што ў маўчаньні тваім,
прырода!
Што ў трызьненьні тваім,
чалавек!..

# Ці пазайздросьцяць мёртвыя жывым?

### *Нататкі пра вёску бесталковую неаграгарадковую*

Напішу нататкі для сваёй шуфлядкі… А хто ж яшчэ, акрамя маёй ласкавай лакіраванай шуфлядкі, шчыра ім узрадуецца? Можа, тоўсты сур'ёзны часопіс, у якім шэдэўрамі хоць гаць гаці, а наш брат, пісьменьнік ды публіцыст, выстраіўся ў чаргу па публікацыю, і чарзе той няма канца-краю, усё адно, як пры Брэжневе – да Маўзалею, а пры Гарбачове – да крамы, па пляшку гарэлкі. А можа, узрадуецца выдавецтва, у якога сем планаў на тыдні. У першы план трапіш – абяцанкамі нацешышся, у другі план трапіш – з накладам пачэшашся, а ў трэці план трапяць войт ды пан. А лепей вядзі карову на базар ды выдавай свае нататкі кніжкаю хоць заўтра. А пасьлязаўтра кладзі сваю кніжку ў торбу і – у народ:

— Падайце беднаму брату-самвыдату на новае войстрае пяро.

Рад бы, даражэнькія, забрытаць кароўку на вяроўку. Ды вось бяда, жыву я не ў Італіі, а ў вёсцы пралетарыем, і з усяго майго нерухомага капіталу самая капітальная і ёсьць

тая лакіраваная шуфлядка. Рэч, вам мушу сказаць, найкаштоўнейшая: яна і крытык мой строгі, і чытач удумлівы. Золата, не шуфлядка: і есьці ў цябе не папросіць, і ганарары табе тваімі ж кніжкамі ня выдасьць…

Напішу нататку – пакладу ў шуфлядку. Казаў сабе: кінь пісаць, курэй сьмяшыць, не патрэбна нікому праўда твая. Людзі, стомленыя хлусьнёю, і да праўды ня вельмі мкнуць. Бягуць яны ад рэчаіснасьці хто куды, уцякаюць куды хто. Вось і там, дзе я жыву, не патрэбны людзям ні культура, ні літаратура. Дык навошта і для каго пісаць? Колькі разоў заракаўся лабацінаю ў сьцену біцца, а вось жа зноў – пішу…

## Я нарадзіўся тут…

"Я нарадзіўся тут і я буду жыць тут!.." "Паўтараю ўсьлед за бардам і думаю сабе, што змусіла мяне, паспытаўшы сталічнага жыцьця, раптам вярнуцца ў самым росквіце сілаў на суглінкава-камяністую Віцебшчыну, у родную вёску, у родную хату, апусьцелую пасьля сьмерці бацькоў, закапаць свае літаратурныя высілкі-пачаткі (калі такія былі) на дзесяці сотках, пахаваць іх, высадзіўшы, як і належыць, на магілцы клумбы яркіх прыгожых кветак… Мо і сапраўды зрабіў я па-маладому безразважна, неабачліва, недальнабачна, непрактычна, зьехаўшы са сталіцы, дзе хоць і было маёй душы холадна, але ж меліся сякія-такія персьпектывы. Паклікаў голас продкаў? Нездарма ж я пісаў тады: «І пачулася мне, бы паклікала маці: Ты прачніся, сынок, ты вярніся сынок…»

Глупства, пане дабрадзею! Які там голас?! Ці мо я тут, у вёсцы, зачарсьцьвеў душою?.. Без кампутара, без "мабільніка", без, пардон, унітазу. Цікава, а душа ў невыгодзе ды без "цывілізацыі" чарсьцьвее?

Пытаньні… пытаньні… Эх! Каб я сам ды ведаў на іх адказы! І ці магчыма пачуваць сябе пісьменьнікам у неаграгарадковай вёсцы? Можа, гэтыя нататкі адкажуць хоць на некаторыя з тых пытаньняў?..

…Нашая хата доўга заставалася накрытай драніцаю, а палова хлява і цяпер яшчэ гаруе пад рубероідам. Кепскі, відаць, з мяне гаспадар. Зрэшты, якое дрэва, такі клін… Бацькоў сваіх я ўспамінаю па-рознаму: калі з гордасьцю, а калі і са шчымлівым болем. Хай сьпяць спакойна, хай ня тлее іх душа. І ўсё ж, хітрыя яны: умудрыліся пакінуць гэты сьвет рана, каб ня ўбачыць яго яшчэ горшым, нібыта ведалі, што сьвет, прынамсі, у бліжэйшы час, надта не папрыгажэе. Бацька быў настаўнікам, а пасьля перайшоў у сельсавет сакратаром. Працаваў шчыранька, пісаніну розную прыносіў нават дадому, бо там, на працы, дня яму было мала. Не было часу падумаць і пра сваю хату. Выпісваў людзям паперы на будматэрыялы, а сабе… Маці, бывала, пад злосьць возьме дый папракне:

— У цябе ўсё ня як у людзей, усе свайго пільнуюцца, а ты, у сельсавеце сядзеўшы круччу, сабе шыферу выпісаць ня можаш.

Так і чакала наша "Раскіданае гняздо" лепшай долі. Пры Брэжневе з шыферам строга было, што нават сакратар сельсавету не адважваўся сабе выпісаць, пры Гарбачове не дастаць было, а зараз вунь нічога не дакупішся. Куды там хлеву прыстойнага даху чакаць, нябо не ў аграгарадку жывем.

Было і горш. Бацька мой не прывык купацца ў раскошы. Прышкандыбаў з вайны на мыліцах, цяжка паранены. Пераспрабаваў шмат якія прафесіі, адзін час быў і кавалём. Выбіўся ў вясковыя інтэлігенты, а ўсё паўтараў у роспачы: "Не куецца, а плешчацца". І то праўда…

Сачыніўшы свой першы верш, запісаць яго я ня мог, бо пісаць ня ўмеў яшчэ як сьлед, а толькі друкаваў асобныя літары. Сачыніў верш і тут жа запомніў: «Маю маму кожны ведае, Мая мама не абедае, Бо што зьеў, то не відаць, Вот такая мая маць!».

Злосны верш. Мы з бацькам пацьвельваліся з маці-службісткі, якая бегла ў школу нашча, не заўсёды пасьпеўшы пасьнедаць. Мама – настаўніца. Бывала, прывалачэ са школы ў дзьвюх валізках сшыткі: дамашнія работы, дыктоўкі, сачыненьні, якія трэба да заўтрага праверыць. А яшчэ планы – рабочыя, каляндарныя, выхаваўчыя. У той час, калі мама настаўнічала, у нашай школе былі класы па трыццаць, а то і пад сорак вучняў. Паспрабуй усё праверыць, усё напісаць. Мама паліць у печцы, есьці паставіла варыць, а сама ўсё планы строчыць. Бацька ёй: "Паеш, завалішся – ніхто ня ўспомніць". А яна ў адказ: "Ат, што зьеў, то не відаць". А калі стала відаць, то было позна ўжо. Аднойчы маму забралі ў бальніцу. Малакроўе. Пасінелі вусны, сэрца зайшлося, і яна ледзь не памерла. Бог тады пашкадаваў нас, малых. Пасьля таго яшчэ доўга жыла… Але вось мамы няма, і прыгадваю бацькава: "Ніхто ня ўспомніць". Не зусім так, маму яшчэ доўга ўспаміналі з удзячнасьцю выпускнікі, але час прайшоў, вучні адхапілі ў жыцьці куды болей, чым іх настаўніца, шчырая службістка. І пра маці, як, зрэшты, і пра іншых яе калегаў, тагачасных настаўнікаў, якія багата чаго зрабілі дзеля таго, каб вёска мая жыла, пра іх ужо ўспамінаюць ня часта. Школа, праўда, стаіць пакуль, але гэта ўжо зусім іншая школа… Зрэшты, да яе мы яшчэ дойдзем, яшчэ вернемся, а пакуль пройдземся па вуліцы.

## Па вуліцы іду ў пазаўчора…

Па якой вуліцы пойдзем? У нас іх дзьве, адна безназоўная, даўжэзная, бяжыць за тры кіламетры, аж да былога калгаснага клуба, аб'ядноўваючы дзьве вёскі: нашую і суседнюю, у адну. Клуб той калгасны даўно загадаў доўга жыць, а вуліца, як ні дзіўна, яшчэ жывая, хаця на выгляд лядачая, як тая дзевяностагадовая бабулька, і ўсё болей чаўрэе з кожным летам. Другая ж нашая вясковая вуліца, што вядзе да возера і школы, так і завецца – Школьная, не па дакументах, а панароднаму. Ахрысьцілі яе дзеля газаўшчыкоў, каб лягчэй тым было развозіць газавыя балоны, каб не было блытаніны, прыдумалі назву вуліцы. Пранумаравалі дамы. Школьная вуліца кароценькая, усяго хацінаў дзесяць, і жывейшая за яе калгасную суседку. Відаць, мясцовая інтэлігенцыя, якая тут жыве, аказалася больш жыцьцястойкай і трывушчай.

Але спачатку пра галоўную вуліцу вёскі. Была яна некалі таксама і прыгожая, і вясёлая, і гаманкая. Помню яе такой яшчэ гадоў дваццаць, ды нават і дзесяць, таму. Вёска нашая, была даволі бойкім і сучасным па мерках разьвітога сацыялізму цэнтрам сельсавету. Бяжыць праз вёску шашэйка на Оршу, да райцэнтру рукой падаць – дзесяць кіламетраў, да ваеннага гарадку яшчэ меней — каля васьмі. Помню, як радаваліся мы, малыя, калі нашую дарогу Аршанку ўсьцілалі сьвежым гарачым асфальтам. Дзе мы маглі бачыць той асфальт, хіба ў горадзе. Заасфальтавалі праезджую дарогу, і я, дзівак, пачаў чакаць, калі возьмуцца за ўзбочыны ды зробяць тратуары. Захацеў! А зрэшты, нядоўга і да іх заставалася, а пасьля да ваеннага гарадку з райцэнтру пусьцілі аўтобусы. Безьліч! Хадзілі ледзь ня кожную гадзіну. Дваццаць капеек — і ты ў Лепелі, пятнаццаць — і ты ў Заслонаве. Наступіў транспартны камунізм! Неўзабаве да прыгарадных далучыліся і міжгароднія: Глыбокае — Орша, Лепель — Орша, Наваполацк — Новалукомль. Хто ў той час мог падумаць, што некалі мая вёска стане неперсьпектыўнай! Далей — болей: асфальт рушыў у вёску, лёг па ўсёй даўжыні яе галоўнае вуліцы, аж да праўленьня калгасу з сімвалічнаю назваю «Новы шлях». Па Аршанцы і наўздоўж усяе калгаснае вуліцы паставілі новы плот і пафарбавалі яго. Праўда, забыліся пра вуліцу маленькую, што вяла да школы, і яна доўгі час яшчэ патанала ў гразі, за што нават вярнула сваю першую, яшчэ да заезджых газаўшчыкоў, назву — Гразілаўка. Ну, ды гэта і ня дзіўна. Па ёй жа ня езьдзілі ні старшыня калгасу, ні сакратар райкаму, яна не

відаць была з вакна лімузіна якога начальства вышэйшага, з Менску, што магло незнарок праехацца па Аршанцы, убачыць нешта такое, што не спадабалася, і ўшпіліць усім папоўніцы.

Тым часам калгас станавіўся на ногі: расьлі ўраджаі, павялічваліся прывагі з надоямі. Цяпер ведаем, не ў апошнюю чаргу дзякуючы тагачаснаму старшыні, чалавеку крутому, рашучаму, часам нават жорсткаму, мог і морду набіць пад гарачую руку, але ж і дзелавому. Хадзіў з народам на суботнікі, нядзельнікі, касу ў рукі і наперад з мужыкамі. Вясёлыя былі тыя суботнікі-нядзельнікі. Куды як весялей, чым зараз, жыў тады народ, хаця ня скажаш, што жыў ён вельмі багата. Я не кажу пра тое, што на іншамарках у вёсцы ня езьдзілі, іх ніхто тады ўвогуле ў вочы ня бачыў. На ўсю даволі вялікую вёску было, нават не помню, мо дзьве ці тры легкавыя машыны. Ды што машыны, каня было ў брыгадзіра не дапрасіцца, а марожанае ў магазіне бачылі хіба што падчас чарговых пустапарожніх выбараў, на якіх загадзя ведалі, хто і ў які Савет пройдзе. Марожанага і машынаў не было, але ж былі вясельлі, хрэсьбіны. Народ купаўся ў таннай «Экстры» па чатыры дванаццаць і весела сабе жыў. Людзі цяпер кажуць: «Камуністы сабе бралі, але і нам заставалася, а зараз...» І скрушна ўздыхаюць. Выходзіць, так. Ну, глядзіце, ад камуністаў у спадчыну засталіся маім вяскоўцам ветэрынарная лячэбніца, новая школа-васьмігодка, ФАП, клуб з бібліятэкаю, зноў жа, новенькі, прасторны будынак сельсавету, магазін, лазьня, слава пра якую грымела на ўвесь раён, ну, проста суперлазьня з цудоўнай саунай, куды езьдзіла пасьцябацца венічкам нават вялікае начальства, пральня. Па-над возерам стаяла малочная ферма. Малако на Лепель вазілі цыстэрнамі. Праўда, куды яно затым дзявалася, незразумела, бо ў тым жа Лепелі, дзе свой малочнакансервавы камбінат, за бутэлькаю пастэрызаванага малака трэба было выстаяць у чарзе, і тое хутка разьмяталі, мясцовае марожанае на смак нагадвала замерзлы адгон, а згушчонкі ўвогуле ніхто з простых сьмяротных у вочы ня бачыў. Трэба было карміць усіх чыста: і Маскву, і Ленінград, і еўрапейскіх сяброў па «лагеры», і, можа, афрыканскіх ды лацінаамерыканскіх «рэвалюцыянераў».

Тым ня менш, вёска будавалася. Якое ж дзіва нам было, калі будавалі першы двухпавярховы дом на чатыры кватэры — у самым цэнтры, паміж дзьвюма хацінкамі на курыных лапках — Антонішынай і суседкі яе Сьцепаніды. У цэнтры псавалі твар камуністычнай вёскі чатыры такія «палітычна шкодныя» хацінкі, як у насьмешку, акружылі магазін, мазолілі вочы начальству. Бабульчыны гнязьдзечкі планавалася спароць, а самім небаракам прапанаваць усе выгоды «на небе», у двухпавярховіку. Вам сьмешна, а ім зусім не да сьмеху было. Яны жагналіся, пазіраючы, як хутка вяледа-кран будуе ім райскую камяніцу. Але «на неба», у камуністычны рай, з іх так ніхто і не пайшоў. Ня так проста аказалася выкурыць старых людзей з наседжаных гнязьдзечкаў. Цёмныя і «несазнацяльныя» бабулькі, відаць, куды лепей, чым палітычна адукаванае начальства, угадалі, якая сьветлая будучыня чакае тую новабудоўлю. І хто надумаўся для вёскі будаваць такія «удобствы»? Гэта ж сьвіньням трэба замяшаць на другім паверсе і перці вядро, язык высунуўшы, у хлеў, аж на вуліцу. Дзіва што ў двухпавярховік ніхто не хацеў ісьці жыць. Жылі там заўсёды наезджыя, а часта — пустадомкі, хто ня меў гаспадаркі, і пры любой нагодзе зручнай адразу ж зьбягалі адтуль. Гадоў праз дзесяць-дваццаць двухпавярховік, на шчасьце, адзіны ў нашай вёсцы (а ў іншых жа набудавалі іх шмат, нібы на зьдзек), заняпаў, выдыхся, застаўся, бадай, без гаспадароў і цяпер аздабляе цэнтр вёскі яскравым музеем-помнікам эпохі камуністычнай “гігантаманіі”. Як у ваду глядзелі нашыя набожныя бабулькі. Зрэшты, неўзабаве яны падаліся ў сапраўдны рай, і эстэтычнае пытаньне ў цэнтры нашай вёскі вырашылася само сабою. Хаціны зьнесьлі — пытаньне зьнялі. А ці так? За дваццаць-трыццаць гадоў мая бедная вёсачка спрэс пакрылася, як каростаю, пахілымі, хіжымі пустымі хацінамі. І не паз-

наць яе. Аднойчы палічыў і жахнуўся, з пачатку сямідзясятых, толькі на маёй памяці, у вёсцы памерла сто адзінаццаць чалавек, у вёсцы, дзе было ўсяго ня болей як дзьвесьце жыхароў. І гэта без вайны, на «чыстай» Віцебшчыне, без Чарнобылю, без эпідэміяў. І калі б не «Карабах» — наш новы, так бы мовіць, мікрараён, пабудаваны крыху пазьней (пра яго раскажу асобна), маю вёсачку ўжо даўно зьнесьлі б на могілкі.

Але вернемся да камуністычнага будаўніцтва. Двухпавярховікаў у нас болей ня ўзводзілі, відаць, да некага ўсё ж дайшла абсурднасьць такой ідэі, а пачалі штампаваць аднапавярховыя і двухкватэрныя. І яны не прыжыліся, бо былі непрактычнымі: цаглянымі, халоднымі. Зараз з гэтых дамоў толькі адзін яшчэ трымаецца. Астатнія ж напаўпустуюць. Тым часам мода і на іх прайшла, як прайшла мода на сацыялізм. А з надыходам новай эпохі ў вёску маю прыйшло і новае будаўніцтва...

## Вайна ў “Нагорным Карабаху”

Вёска мая ніколі не была, як раней казалі, «цэнтральнаю сядзібаю калгасу». Тут быў цэнтр сельсавету, а калгасная кантора месьцілася ў суседняй вёсцы, кіламетры за два, а паміж вёскамі лягла ўзгоркавая мясцовасьць, часткова зарослая хмызьняком, часткова ўзараная ды засеяная. Ніжэй — аж да лесу, балота. Камуністы ўвесь час марылі злучыць дзьве вёскі ў адну, усё тая ж хвароба — гігантаманія. Але так і не злучылі, ці то не пасьпелі, ці то не хапіла сілаў. Што не ўдалося нашым, тое зрабілі... немцы, а «дапамог» Чарнобыль. Неўзабаве пасьля восемдзесят шостага году з Гомельшчыны да нас прыехаў новы кіраўнік, чалавек талковы, гаспадар. Кажуць, на Гомельшчыне людзі яго таксама хвалілі, і адпускаць не хацелі. Але змусіла зьехаць з родных краёў радыяцыя. Самае галоўнае і важнае, што ехаў ён сюды да нас не часова, а назаўсёды. Зьбіраўся асесьці тут і таму планы будаваў сур’ёзныя — і для сябе, і для людзей. І многае зрабіў. Зрабіў бы і болей, калі б не перашкодзілі. Крывіць душой ня буду, сябе гэты чалавек таксама не пакрыўдзіў, але і людзям пры ім сёе-тое перапала. А хто са старшыняў нашых калгасных сябе ўкрыўдзіў? Пасьля першага, мясцовага, пра якога я казаў ужо, пачалі іх тады як у сячкарню закідваць. Усе нетутэйшыя, усе часовыя. Прыедзе, распачынае дом сабе будаваць, пабудуе, пакруціць хвастом і — да пабачэньня. Заняпаў калгас, пачалі яго тузаць, на кавалкі разрываць, далучаць-расфарміроўваць. Кралі і раней, а калі ня стала каму пільнавацца парадку, раскрадаць пачалі яшчэ болей. Не цягнуў з калгасу хіба што лянівы. Я заўсёды дзіўлюся, якія ж багатыя нашыя калектыўныя гаспадаркі, ну, проста бочка нейкая бяздонная. Крадуць, крадуць, а ўсё адно ёсьць што красьці. Сьцягнуць у калгасе лічылася сьвятою справаю, гэта не ў суседа. Заняпала жывёлагадоўля, разбураліся фермы. Што яшчэ было ацалела, людзі самі дапамаглі расьцягнуць. «Новы шлях” прывёў у нікуды. А чалавечай прагнасьці няма межаў, чым больш цягнулі, тым больш хацелася. Пачалося разбурэньне гаспадаркі яшчэ пры камуністах, калі дзяржава-імперыя хоць і стаяла пакуль, але ўжо трашчэла па ўсіх швах. Калі ж калгас наш дайшоў-дабіўся да пугаўя і, нібы ратуючы, яго расфарміравалі і ўвапхнулі ў склад суседняй, вялікай гаспадаркі, што займала ледзь не паўраёну, мы і ўвогуле апынуліся проці ліха на ўзгорку, дзе пень на калоду брэша. Да нас нікому не было справы. Да Бога высока, да цара далёка. Ні паскардзіцца, ні дапамогі папрасіць. Жылі людзі, як маглі, як умелі, руйнуючы апошнія свае калектыўныя здабыткі, якія нажывалі гадамі. Праўда, неўзабаве там, наверсе, агледзеліся, адумаліся, вырашылі зноў вярнуць нашай гаспадарцы самастойнасьць, але вяртацца ўжо фактычна не было да чаго. Вось у гэты час, ня помню, па-мойму, на пачатку перабудовы, раптам аддаюць нас пад патранаж... Менску, і мы становімся абласной сортавыпрабавальнай станцыяй. Ніхто ня ведаў,

што гэта такое, і як мы тут будзем жыць, новаму Богу маліўшыся, але да многіх зноў, як ні дзіўна, вярнуліся надзеі на лепшае. Можа, бо час быў такі? Перабудова, усім хацелася пераменаў, і ўсе спадзяваліся, што ўжо горш чым было ня стане. Куды горш, калі людзям не было дзе ў вёсцы працаваць, а калі і была праца, то гарбаціліся задарма. Рынуліся былі ў горад, балазе яшчэ транспарт хадзіў больш-менш рэгулярна, але і ў горадзе ўжо быў ня мёд. Спыняліся заводы, затрымлівалі, а то і не плацілі зарплату. Утрымацца б хаця гараджанам, а ўжо галоты з вёскі тут аніяк не чакалі.

Вось у такі час кіраваць да нас прыходзіць, як казалі, «чарнобылец». Прыехаў не адзін, а з цэлай сваёй «рэзервацыяй» з некалькіх сем'яў. Нехта сказаў бы — «гета», а некаторыя злыя языкі называлі «гомельскім кланам». Неўзабаве прывёз ён і немцаў. І пачаўся ў нашай вёсцы новы этап будаўніцтва. Ну, зусім як у вайну, калі ў Сібіры на пустым месцы імгненна выраслі абарончыя заводы, гэтак і ў нас на месцы разбураных фермаў як грыбы павырасталі бетонамяшалкі. Зьнекуль паявілася і цэгла, і цэмент, і іншыя будматэрыялы. Людзям знайшлася праца. Я ня помню другога такога выпадку, калі б на працу пайшлі нават нашыя мясцовыя «бомжыкі». Ёсьць жа ў кожнай вёсцы такі кантынгент, што нідзе не працуе, але кожны дзень знаходзіць за што выпіць. Вось і ў нас «бамжуе» багата вясковай моладзі. Нежанатыя, бо ўжо «ажаніліся» з бутэлькаю, беспрацоўныя, бо хто ж іх на працу возьме, калі заўтра нап'ецца. То зьбіраюць металалом з макулатураю ды здаюць, зусім як піянеры-цімураўцы, то, зноў жа, як цімураўцы, дапамагаюць старэнькім, адзінокім бабулькам дровы прывезьці пасекчы, справіцца на агародзе. Дык вось, і ім на той час на станцыі знайшлася работа. Выдаў ім новы наш кіраўнік індульгенцыю, крэдыт даверу, так бы мовіць. Праўда, хутка ж і расчараваўся ў гэткіх працаўніках.

Домікі паміж дзьвюма нашымі вёскамі ставіліся ў дзьве шарэнгі па адным, уздоўж дарогі, аднолькавыя, як салдаты — шэрыя, невыразныя знадворку, але даволі утульныя ўсярэдзіне. Праўда, немцы крыху аздобілі той салдацкі шыхт сваім еўрапейскім стылем, пабудаваўшы на зьдзіў людзям два прыгожанькія домікі з... гліны ды саломы. Кажуць, яны вельмі цёплыя і экалагічна чыстыя. Так пачалося жыцьцё ў новым вясковым мікрараёне — у "Нагорным Карабаху". Чаму такая экзатычная ў яго назва? Гэта фальклор народны. Афіцыйнай назвы новабудоўлі ніхто так і не прыдумаў. Справа ў тым, што яго першыя насельнікі, людзі таксама прышлыя (у нас іх называлі больш злосна — прыблуды), пачалі між сабою варагаваць, не падзялілі водаправодную калонку на вуліцы, даходзіла ледзьве не да вайны, калі гаспадыні гатовыя былі тузаць адна адну за валасы. А ў той час, як ведаем, якраз былі неціхоты ў далёкім Нагорным Карабаху. Вось з нейчага трапнага языка (зрэшты, мы ведаем, з чыйго) і сарвалася: «Ізноў у Нагорным Карабаху за калонку ваююць». І пайшло, і паехала. Прыметнік не прыжыўся, з гадамі адпаў, а назва «Карабах» прыліпла, засталася.

З таго часу не адна «вайна» пракацілася (дый коцяцца) па нашым Карабаху. Яно і ня дзіўна. Жывуць там людзі ў асноўным маладыя, са ўсяго сьвету. Ёсьць і добрыя, спакойныя, зычлівыя, а бываюць і, як кажуць, перакаці-поле. Нехта прыехаў да нас, ратуючыся ад чарнобыльскай навалы, і гэта зразумела, а хтосьці проста гойсае па сьвеце, шукаючы дзе лацвей, шукаючы лёгкага хлеба, такім людзям усюды не да носу.

Новы наш пасёлак вырас усяго за некалькі перабудоўчых гадоў, і зараз гэта ўжо відавочна: ён выратаваў нашую вёску ад сьмерці. Калі б ня ён, не было б у нас сёньня ні школы, ні дзіцячага садка, бо ў старой вёсцы ўжо колькі гадоў ніхто ня жэніцца, не нараджаюцца. Зрэшты, садка ўжо й так, лічы, няма, ён цяпер маленечкі, аб'яднаны са школаю, а некалі стаяў асобна, у хмызьняку, на балацявіне, у Карабаху. Садок — апошняя сацыяльная новабудоўля ў маёй вёс-

цы. Пабудавалі яго, калі не памыляюся, на заходзе сацыялістычнай эпохі і, як заўсёды, бесталкова, выбраўшы для такога аб'екта месца — горш не прыдумаеш: балота і кусты. Летам не было там спачыну дзеткам ад камарэчы. Затое будавалі садок, вядома ж, з размахам. Куды там! Памяшканьняў розных — хоць вы, дзеткі, у футбол ганяйце. А дзетак на пальцах пералічыць можна. Можа, тая бязглуздая гігантаманія і загубіла садок. Як насталі часіны, калі пачалі ўсё лічыць і эканоміць на паліве, а дзяцей да гэтага часу яшчэ і паменела, то вырашылі дзеля эканоміі перасяліць садок у школу. Пакоі, ледзь ня панскія, засталіся пуставаць, на шчасьце, пуставалі нядоўга. Памяшканьням садка пашанцавала болей, чым, скажам, сельсавету, пра які я яшчэ раскажу, а ў былы садок неўзабаве перасяліліся спачатку клуб, затым бібліятэка, і нарэшце — пошта. Падумайце толькі: у садку, які будавалі для дзясятку-другога дзяцей, памясьціліся і клуб, і бібліятэка, і пошта, і яшчэ некалькі пакояў пустуюць. Клуб наш слаўны буйным норавам, нездарма ж стаіць на «Карабаху». Дыскатэкі там жорсткія і крывавыя, як войны. А бібліятэка, наадварот, ведама, у балоце, ціхмяная і сумнаватая. Як ні стараецца бедная жанчына-бібліятэкарка, як ні варушыцца, а чытачоў усё роўна кот наплакаў. Дзе ўзяцца тым заўзятарам-чытачам? І яшчэ, што чытаць? Старыя кніжныя фонды, якія засталіся ў спадчыну ад камуністаў, сёньня ўжо мала каго цікавяць, хоць і захоўваюцца тут беражліва. Што ж яшчэ захоўваць, калі ня іх? І нават класіку, бадай, ніхто не бярэ ў рукі. Чытаць не засталося каму. Новых жа кніг амаль не паступае. Таго, што выходзіць талковага ў сталічных выдавецтвах, у «глыбінцы» днём з агнём ня знойдзеш, кажу пра беларускамоўныя выданьні. Праўда, сталі акуратна прыходзіць выданьні перыядычныя: тыя ж «ЛіМ», «Маладосць», « Полымя», «Нёман». Як прыходзяць, так і кладуцца на паліцу пыл зьбіраць. Скрушныя парадоксы жыцьця: большасьць літаратурных выданьняў, стаўшы каляровымі, зрабіліся шэрымі. Хаця яшчэ гадоў з дзясятак таму яны, шэранькія і сьціплыя на выгляд, прыпадносілі чытачу ў падарунак яркую, каляровую літаратурную палітру. Чытаў нядаўна развагі Алеся Адамовіча «Путешествие из Минска в Москву и обратно» ў кудраўцоўскім «Нёмане» 1994 году. Колькі колеру, колькі экспрэсіі ў той гарачай, па-грамадзянску мужнай, шчырай публіцыстыцы!

Але вернемся ў «глыбінку». Так, нямнога тут засталося сталага, удумлівага чытача, аматара, а то і фанатыка беларускай кнігі. Але ж ня трэба думаць, што жыве ў вёсцы адно люд цёмны ды забіты, які праглыне ўсё, што ні падай яму на стол, да літаратурнае вячэры. І вясковага інтэлігента на мякіне не ашукаеш...

## Свае і чужыя

Цікавы быў час — перабудова. Ворагі пераставалі здавацца ворагамі, адкрываліся межы. Еўропа хоць і насьцярожана, ды пільна пачала прыглядвацца да геаграфічнай прасторы былой «імперыі зла». І — адкрывала для сябе, што мы... таксама людзі, што з намі можна справу мець. Мы не засталіся ў даўгу: мы таксама адкрывалі Еўропу і — ня верылі сваім вачам. Аказваецца, хтосьці жыве лепей, чым мы. Быць ня можа! Асабліва дзівіліся мы і немцы. Новыя стасункі з Германіяй перажывалі тады мядовы час. Немцы ня ведалі, чым нам аддзячыць за тое, што нарэшце рухнула Берлінская сьцяна, а мы разгублена прымалі іх дарункі і не разумелі, што ім яшчэ ад нас трэба. Зрэшты, і адны, і другія вельмі хутка дапетрылі і зарыентаваліся ў сітуацыі.

Ітак, немцаў прывёз у нашу вёску той самы дырэктар-паляшук, які прывёз нам шмат надзей на адраджэньне. Немцы былі адной з тых надзеяў. Ці прыехалі яны па лініі чарнобыльскага фонду, ці згодна яшчэ якой праграме, гэтага вам не скажу, бо, шчыра кажучы, не цікавіўся. Магчыма, не пускалі «генетычныя замкі».

Як-ніяк, бацька ў сорак другім атрымаў пад Серпухавам у «падарунак» не чыюнебудзь, а нямецкую разрыўную кулю, пасьля чаго стаў інвалідам. І маці ля Докшыцаў, у лагеры, гнаілі ў той жа час на мёрзлай саломе ня хто іншы, як немцы... Я ведаю, што гэта ўжо ня тыя немцы, а іх дзеці, унукі. Ведаю, што сын за бацьку не ў адказе, а тым болей унук за дзеда. Разумею, што гітлеры прыходзяць і сыходзяць, а застаецца народ... Але ж памяць, памяць жыве...

Немцы аблюбавалі былі нашу вёску ўсур'ёз і надоўга. Прыязджалі даволі часта, спыняліся ў школьным інтэрнаце, дзе, дарэчы, часова пасяліўся і сам дырэктар. А неўзабаве пачалі спыняцца «на пастой» і ў некаторых нашых, якія гасьцінна іх прымалі і ня ведалі, куды пасадзіць і чым частаваць. Ці рабілі гэта ад душы, ці свой карысьлівы разьлік мелі — справа іх асабістая. Прыязджалі немцы, а ўсьлед за імі — фура з прадуктамі, адзеньнем. Першы раз яны разносілі прадукты самі па хатах, раздавалі падарункі да Калядаў, вельмі ветліва, культурна віншавалі. І была ў той культурнай ветлівасьці нейкая няёмкасьць, нібыта вінаватасьць. А мо нам проста здавалася. Але далей-болей, гуманітаркі ўсё прыбывала. Фуры ўжо проста спыняліся дзесьці ў пэўным месцы, ці сярод вёскі, ці нават ля фермы. Вестка пра іх хуценька, па «бабскай пошце» аблятала ўсю вёску, зьбіраўся народ, які ўжо дагэтуль сядзеў намылены, чакаў. І — што тут пачыналася, не паддаецца апісаньню... Народ штурмам, як крэпасьць, браў падыходы да фуры. Кожны імкнуўся як найхутчэй дарвацца да дармавога і нахапаць сабе лепшага. Прадуктаў вазілі ўсё меней, а ўсё болей было анучаў, часьцей — «сэкэнд хэнд». Ён яшчэ мо і зараз валяецца ў каго на гарышчы, у каго — па шафах. Сёй-той насіў нямецкае, але ня ўсе і ня ўсё, што нахапалі. Мацней за чалавечую годнасьць аказалася прага хапаць, грэбці, ухапіць як мага болей, ці то каб сьцьвердзіць сябе, маўляў, і я ня горш за людзей, ці то каб пахваліцца пасьля перад суседзямі — глядзіце, які я спрытны і «круты». Прага тая ўсё нарастала, як сьнежны ком. Яна рабіла ўвогуле ж ня злых людзей — чалавеканенавісьнікамі, зьвярамі (вы прабачце, добрыя зьвяры), а калектыў, гурт — статкам, які засумаваў па пастуху... Народ гатовы быў ісьці па галовах — з-за барахла. Немцаў ахапіў шок. Далібог, гэтым разам яны ня мелі намеру ўсталёўваць на Беларусі новы еўрапейскі парадак. Ехалі з адкрытымі, шчырымі намерамі. Ехалі, калі хочаце, павінавацiцца. Іншыя гістарычныя варункі... Але вось яны зноў, ЯК ТАДЫ, сьмяюцца і калі ня ўголас, то самі сабе, напэўна, зноў прамаўляюць: «Русіш швайн»! І — фатаграфуюць. Будзе што паказаць дома. Уражаньні з Расіі... (Беларусь яны так і не ўсьвядомілі як асобную ад Расіі дзяржаву). У дзевяностыя, пад час «другога прышэсьця» немцаў у нашую вёску, мне, можа, упершыню так сорамна і крыўдна зрабілася за землякоў сваіх. Зрэшты, магчыма, я занадта суб'ектыўны і згушчаю фарбы. Менавіта ў тыя дні, вяртаючыся дадому з пасылачкай нямецкай гуманітаркі, дачасна загінула мая мама. Павалілася проста на дарозе і болей не паднялася. Мо гэта было ўсяго толькі супадзеньне? Я часта дакараю сябе, што ня мог быць у тыя хвіліны побач з ёю. Я часта спрабую ўявіць, аб чым думала мама ў апошнія хвіліны свайго жыцьця, несучы ў пасылцы для ўнучка нямецкія «трафейныя» чаравічкі? Ці не аб той гнілой ды мерзлай саломе, што ля Плешчаніцаў?..

Зрэшты, неўзабаве немцы перасталі вазіць нам гуманітарку. Можа, зразумелі, што яны нас прыніжаюць тым самым, а можа, убачылі, што тая гуманітарка стала між намі косткаю разладу…

Чужынцы ўвогуле кепска прыжываюцца ў маёй вёсцы, хаця і сама яна як быццам «не свая». Вёскаю стала параўнаўча нядаўна, толькі пасьля "эвакуацыі", калі зьехаў пан, а на месца, дзе ў пяці хацінах жыла яго прыслуга, пачалі са сьвету зьязджацца людзі. У нас і дагэтуль ведаюць адных як «залескіх», другіх — як «кардзякоў» і г.д. — па назвах вёсак, адкуль прыехалі. Чужымі ў нашай вёсцы аказаліся ня толькі госьці з Заходняй Еўропы, але і людзі значна бліжэйшыя, што

ехалі сюды ня дзеля нейкіх дабрачынных памкненьняў, а з больш сур'ёзным разьлікам. Яны зьбіраліся тут жыць. Яны да нас уцякалі ад бяды і ня думалі, што напаткаюць тут бяду яшчэ большую, што мусяць зноў уцякаць — адсюль, назад, у радыяцыю. Маю на ўвазе тыя некалькі сем'яў з Гомельшчыны, якія прыехалі да нас першапраходцамі ў дзевяностыя гады.

Новы дырэктар працягваў ажыцьцяўляць свае грандыёзныя па вясковых паняцьцях, хоць часам і па-дзіцячы летуценныя, планы. Рос, прыгажэў наш Карабах. Ужо ня толькі ўздоўж дарогі, але і да лесу праектавалі вуліцы. А ля лесу, на ўзгорку, хацелі ўзьвесьці царкву. Чаго-чаго, а царквы ў нашай бязбожнай вёсцы не было ніколі. А шкада. Шмат каму не зашкодзіла б паспавядацца, а то і замаліць грахі... Дапамог наш новы дырэктар і ў школе зрабіць капітальны рамонт, і студню, тую самую, ля якой немцы любілі плёхацца, вярнуў да жыцьця, паставіўшы на ёй новы зруб. Праўду сказаць, як кіраўнік ён быў строгі, патрабавальны, а для гультаёў ды зладзеяў нават грозны, але ж і слухаў людзей, і суперажываў. Да чужое бяды чуйны быў чалавек. Ды чым болей рабіў для людзей, тым болей выклікаў у іх непрыязь, непрыняцьце, непаразуменьне. Знайшліся зайздросьнікі, зласьліўцы: кагосьці выгнаў з працы, кагосьці за руку нячыстую злавіў, красьці беспакарана цяжэй стала, камусьці, мабыць перайшоў дарогу, хто меціў у яго крэсла. Мазолілі людзям вочы і два катэджы на беразе возера, якія хоць і ня так хутка, але ўсё ж падрасталі. Праўда, у адрозьненьне ад сваіх папярэднікаў, новы наш кіраўнік так і ня вылез са школьнага інтэрнату ў сваю ўласную хаціну. Не пасьпеў? Пачалася грызьня «пад дываном», суды-перасудкі. Убачыўшы тую цяганіну, захваляваліся і немцы, сабраліся зьязджаць далей ад граху. Урэшце, дырэктар ня вытрымаў, здаўся, зьехаў назад, на Радзіму, дзе яго зноў прынялі ў абдымкі землякі і прызначылі дырэктарам саўгасу. Разам з ім на Радзіму падаліся ад нас і астатнія яго гомельскія людзі. Так «зьелі» мае землякі чужога чалавека. Разьвіталіся ня проста з талковым кіраўніком, а з уласнай магчымасьцю выбрацца з таго балота, у якое загнала іх жыцьцё. Так, новае – яно заўсёды невядомае, а невядомасьць пужае. Лягчэй жыць, працаваць па-старому, па-звыкламу. Лягчэй украсьці, чым зарабіць, асабліва калі ў тваім заробку ня надта хто зацікаўлены.

Вялікае бачыцца на адлегласьці, зараз, праз многа гадоў, мае вяскоўцы часам узгадваюць "зьедзенага" імі палешука добрым словам: вось, маўляў, каб ён зараз быў… Мімволі ўспамінаеш Высоцкага: "Переживают, что съели Кука"… А на беразе возера помнікам красуюцца два гомельскія катэджы, нічыйныя, напаўразбураныя, а галоўнае, нікому непатрэбныя, забытыя, як забытыя Богам мае небаракі-землякі ў неаграгарадковай і бесталковай вёсачцы…

## Вуліца Сьвядомая

Калі становіцца скрушна і вусьцішна ў бяздонным, пачварным сьвеце хлусьні, двурушнасьці і ашуканства, калі ўзьнікае жаданьне сысьці адтуль ці на час, ці назаўсёды, я ведаю, што ў мяне ёсьць маленькі, непаўторны і непараўнальны запасны Сусьвет. Толькі тут я дома... толькі тут... Мой Сусьвет мае форму трохкутніка з трыма аднолькава роўнымі, аднолькава дарагімі сэрцу майму куткамі. Хата на вуліцы Сьвядомай, ля школьнага стадыёна, дзе ў ганаровай варце майго душэўнага спакою застылі стройным шыхтам беластволыя бярозы. Возера лагодных цёплых хваляў, што змывалі-зносілі неаднойчы і бяду, і скруху, і стомленасьць жыццём. Там берагі парасьлі асакарамі ўспамінаў, а дзесьці ў надводных крыніцах-вірах закружыла-схавалася юнацтва маё. Могілкі за вёскаю ў полі, дзе разам з бацькамі пахаваў я свае лепшыя надзеі, куды і сам прыйду аднойчы абавязкова, колькі б ні доўжылася мая дарога...

Вуліца мая — Гразілаўка, Зялёная, Школьная, Сьвядомая... Як яе толькі не

называлі. Езьдзілі па ёй, выбівалі, вытоптвалі, каму не лянота, пакуль (якая там вуліца — сьцежка нешырокая, некалі зялёная, травяністая, якую бацька мой пусьціў хадзіць па агародзе, каб да школы было бліжэй) не ператварылася ў балота. Дзіва што. Па сьцежцы, дзе даўней хадзілі толькі людзі, раптам рынулася тэхніка, цяжкая, грузавая, хіба толькі на танках ня езьдзілі. А падсыпаць пяску нікому і ў галаву не прыходзіла. Навошта? Ніхто не падганяе, не прысьпешвае, не патрэбная была начальству вуліца мая. Да таго было дайшло, што і дроў не прывезьці дадому па гразідле і балону газавага не памяняць, ня кажучы пра тое, што нават улетку не дайшла б сюды «хуткая дапамога».

Я на той час у «Чырвонай змене» працаваў. Ня вытрымаў, «выкарыстаў службовае становішча»: напісаў пра бядоты нашай вуліцы і матэрыял даслаў у Лепельскі гарвыканкам на рэагаваньне. Час яшчэ быў савецкі, выканкамы былі напраўду камітэтамі выканаўчымі, выконвалі загады партыі. Але, здаралася, тут сядзелі людзі самастойныя і самадастатковыя. Ну, а з прэсаю, асабліва з рэспубліканскай, лепей не жартаваць. Адным словам, тыдні праз два прыходзіць у "Чырвонку" стандартны адказ з Лепелю, маўляў, факты прыведзеныя маюць месца і вышэйназваная вуліца «в таком-то квартале будет заасфальтирована»... І адзін квартал мінуў, і другі пачаўся — стаіць наша вуліца як стаяла, як мясілі па ёй машыны гразюку, так і месяць. Недзе падумалі ў раёне: ну, які там карэспандэнт з Менску паедзе правяраць? Рэагаваньне адправім — і няхай супакояцца. Не ўлічылі, што карэспандэнт мясцовым акажацца, што так проста не супакоіцца. Калі прыехаў з той іхняй паперкай у Лепель, на мяне ў гарвыканкаме глядзелі як на марсіяніна. Завітаў з паперкаю проста да старшыні. Падобна, што рэагаваньне, дасланае ў газету, ён бачыў упершыню, але выгляду не падаў, а размову павёў канктэтную. Паперак ён мне болей ніякіх не даваў, але даў цьвёрдае слова, па-чалавечы паабяцаўшы дапамагчы. І слова сваё стрымаў...

Абяцанае спраўдзілася. На зьдзіў маім суседзям, а то і на зайздрасьць (у сяго-таго быў ледзьве ня шок), прымчала на вуліцу нашую будаўнічая тэхніка, пяску навазілі і паклалі, праўда, хоць і па сьвежым пяску, асфальт. Сьпяшаліся пасьпець да асеньняй слоты. Лішне казаць, што ўсе мы, жыхары нашай невялічкай вуліцы (а жылі тут на той час у асноўным пенсіянеры) радаваліся, як дзеці... Пасьпелі будаўнікі ня толькі да прыроднага міжсязоньня, але і да палітычнага. Калі на той час нашая «мікрацывілізацыя» каштавала раённаму бюджэту ўсяго дваццаць тысячаў рублёў і была для яго фінансава, бадай, неадчувальнай, то гады праз два, калі шалёна заскакалі «зайцы» і завылі ў роспачы «ваўкі», прадчуваючы фінансавыя катастрофы, дзяржаве было ўжо не да нашага няшчаснага завулку. Прайшло, бадай, дваццаць гадоў з таго часу. Асфальт, тым больш пакладзены на скоры хап, на сьвежы пясок, патрэскаўся, дзесьці разваліўся. Дарэмна мы думалі, што абыдзецца ўсё, бо не пад танкі ж тут вуліцу мосьцяць. Марозныя зімы, калі нават няма каму пачысьціць тут сьнег, шумлівая вясеньняя вада, а таксама грузавікі зрабілі сваю разбуральную справу. Але мы вельмі беражэм свой асфальт: даглядаем яго, падмятаем, чысьцім. Колькі б ні сьпявала радыё пра шчасьлівае вясковае жыцьцё, колькі б ні расказвала БТ казак пра тое, як імкліва расьце наш дабрабыт, мы ўжо на сваёй Сьвядомай вуліцы ня надта спадзяемся, што дзяржава зноў успомніць і пра нас. На дзяржаву спадзявайся, а сам старайся...

Лёг асфальт — і сталі на вуліцы нашай будавацца маладыя. Спачатку аблюбаваў яе калгасны сьпецыяліст з жонкаю настаўніцай. Пабудавалі тут прыгожы сучасны домік, на манер гарадскога, з усімі зручнасьцямі. Неўзабаве гаспадар сышоў у бізнэс, бо хіба самазабойца ў наш час застанецца на ўсё жыцьцё ў калгасе сьпецыялістам. Затым жа кінуў вока на наш райскі куточак і нафтавік, які вахтавым метадам працуе ў Расіі, на Поўначы. Людзі, скажу вам, з галавою. Такія заміж абразоў на куце палітыкаў разьвешваць ня будуць, як каторыя нашы вясковыя

ваяўніча набожныя палітбабулі. А пасьля яшчэ з Менску масажыст тут купіў сабе дачу. Дадайце сюды пісьменьніка. Ну, ня вуліца, адным словам, а «суцэльныя пазьнякі» — гойстры галаўны боль для ўладаў, асабліва ж пад час чарговага якога плебісцыту. Як толькі ў вёсцы псуецца стопрацэнтны паказчык на выбарах, так ужо сельсавецкі старшыня ваўком глядзіць на тых «сьвядомых». Пра старшыню я яшчэ скажу, а зараз пра «сьвядомых». Верце ня верце, але самыя сьвядомыя беларусы паходзяць з... Афрыкі. Вырас на нашай вуліцы, надыхаўшыся родным, гаючым паветрам шчырай беларушчыны, хлопчык-мулацік. Маці ў яго беларуска, а бацька паходжаньнем з адной з афрыканскіх краінаў. Пазнаёміліся і пажаніліся бацькі ў Менску падчас вучобы. Ня хлопчык вырас, а золата: ён і паэт, і мастак, і музыка. Вершы цудоўныя піша, карціны яго па выставах вандруюць. Зараз у Менску вучыцца і адным з беларускіх музычных гуртоў кіруе. Не адразу ў вёсцы прывыклі да чорненькага суседа, але — прывыклі, і дзіва ўжо нікому няма. А зьдзіўляе людзей зараз ня колер яго скуры, а мова — чысьцюткая, беларуская, ня тое, што нашая «трасянка». А калі «несьвядомыя» зьдзіўляюцца, маўляў, упершыню бачаць, каб афрыканец па-беларуску гаварыў, хлопец ім скрушна адказвае, што, на жаль, не ўпершыню беларусаў сустракае, якія і сказу на сваёй роднай мове зьвязаць ня могуць. Вось і ёсьць наш вясковы афрыканец – самы беларускі беларус.

## Школа вокнамі ў нікуды

Але асноўная крыніца жыцьця нашай маленькай вуліцы, безумоўна, школа. Тут вучыўся я, тут вучылі мае бацькі, тут прайшло дзяцінства маё, і таму бяз шчымлівага, трапяткога хваляваньня не магу я расказваць пра нашую школу, якая сёньня дыхае на ладан і ў якой зараз вучацца ня болей як тры дзясяткі дзяцей — гэта ў дзесяці класах. Разумею, што ня сёньня-заўтра нашую школу зачыняць і тады... Проста ня хочацца думаць, што будзе тады...

Узгадваючы нашую школу, я блукаю між двума пачуцьцямі між несхаванаю гордасьцю за школу тую, майго дзяцінства, і сарамлівай няёмкасьцю, шкадобаю за яе сучасную.

Школа стаіць на высокім, стромым беразе возера — мажа, найпрыгажэйшым месцы ў вёсцы. Вясною, калі разьвітваецца з дзецьмі да восені апошні званок, школа патанае ў цэрпкіх абдымках чаромхі і бэзу. Урачыста-белая прыгажуня з вышыні птушынага палёту нагадвае літару «Ш». Цікава, што будавалі школу самі настаўнікі, мужчыны лазілі, рабілі дах, жанчыны дапамагалі на іншых работах. Настаўнікі на канікулах, у вольны свой час, езьдзілі па матэрыялы. Ніхто ў іх не пытаўся згоды, гэта было як бы само сабою зразумелым. Не магу ўявіць сучасных нашых «транзітных» настаўнікаў, большасьць якіх езьдзіць да нас з райцэнтру, за падобным заняткам. Ды што там будаўніцтва, цяжка ўявіць сучасных настаўнікаў, якія б пасьля ўрокаў заставаліся з дзецьмі, калі таго не прадугледжвала тарыфная сетка. Нашая школа мела вялікі прэстыж у раёне: з яе сьценаў выйшлі добрыя будаўнікі, дактары, інжынеры, сьпецыялісты сельская гаспадаркі, шмат педагогаў падрыхтавалі сабе на зьмену нашыя тагачасныя настаўнікі, але, на жаль, мала хто з гэтай зьмены застаўся на Бацькаўшчыне. Адзін час нашая школа ледзьве ня стала дзесяцігодкаю. Дабудавалі новы школьны корпус, перавезьлі зьнекуль новы будынак пад школьны інтэрнат. Усё ішло да дзесяцігодкі. Больш таго, можна меркаваць, што і сам тагачасны дырэктар быў асабіста зацікаўлены, адкрыць тут дзявятыя-дзясятыя класы, бо акурат заканчвала васьмігодку яго дачка. Але... але нешта перашкодзіла: ці то дзяцей не хапіла для камплекту, ці не дацягнулі з матэрыяльнай базаю. Школа так і засталася з васьмю класамі, якім з кожным годам станавілася тут усё прасторней...

Эпоха барабаннага бою мінула, хацелася б, каб незваротна. Але трэба прыз-

нацьтаксама, што і яна прынесла ў нашую школу пэўнае ажыўленьне, якое ішло не толькі з-пад ідэалагічнай пугі. А яшчэ хачу заўважыць, між іншым, што ў тыя, шасьцідзясятыя, сямідзясятыя гады, хто б там што ні казаў, наша школа была цалкам беларускамоўнай, не на паперы, а па факце. Бо ўсе прадметы вяліся выключна на беларускай мове і па беларускіх падручніках. «Навучыўся я слоў беларускіх ад маці І дум беларускіх без школы і кніг». Прачытаўшы ў Купалы гэтыя радкі, пасьля ўжо, задумаўся і зьдзівіўся, як трапна ён пра мяне напісаў... А калі сур'ёзна, то Беларусь пачынаецца з калыскі.

Мама, класны кіраўнік у старэйшых, рыхтуе вечар па творчасьці Янкі Купалы. Як заўсёды, таўкуся пад нагамі, малы, мусіць, першакласьнік (а мо і ўвогуле тады яшчэ ў школу не хадзіў). Чым бы дзіця ні цешылася, абы ня плакала, каб хоць чым заняць, мне даручаюць... выступаць на вечары. Буду чытаць на памяць купалаўскага «Хлопчыка і лётчыка». Колькі ж гонару! Цяпер я ўжо ня пяты хвост, я — выступоўца! Кожны вечар разам са старэйшымі бягу на рэпетыцыі. Яны развучваюць «Курган», інсцэніруюць «Бандароўну», і ў мяне, малога, праз колькі часу ўжо абедзьве гэтыя паэмы ад зубоў адскокваюць. Вось так прыйшло да нас, «сьвядомых», пачуцьцё нацыянальнай гордасьці і годнасьці. І хто там з «блакітнага» экрана чаўпе?.. Якая Амерыка?! Якія даляры?!

«Скургаціў бы душу чырванцом тваім я, Гусьлям, княжа, не пішуць законаў...». Беларусізацыя працягвалася ў нашай школе роўна датуль, пакуль працавалі мясцовыя настаўнікі. Калі ж пайшоў «транзіт» то з Лепеля, то з Заслонава, дзе афіцэршам не хапала працы, паступова папоўз у школу «великий и могучий». Спачатку афіцэршы, відавочна нярвуючыся, вялі ўрокі па беларускіх падручніках, але парускu, часта пацьвельваючыся з нашай «деревенскости», а пасьля — «всё смешалось в доме Аблонских». Вяршыняй перамогі паўзучай русіфікацыі стаў модны сучасны вектар: «кто как хаціт, тот так и гаварыт». Школа здалася...

А тут яшчэ міжсабойкі... Трэба сказаць, што традыцыя «міжусобных войнаў» вельмі моцная ў нашай школе і вядзецца здаўна. Яшчэ ў шасьцідзясятыя-сямідзясятыя гады, калі школа была на ўздыме і прэстыж яе быў высокі, гэта не перашкаджала настаўнікам ваяваць з тагачасным дырэктарам. Ото ж была бойка! І што там не падзялілі, казаць ня буду, было даўно, дый любая гіпотэза кульгае. Верагодна, касьцяк настаўнікаў мясцовых, у той час яшчэ маладых і энергічных, ваяваў за дырэктарскае крэсла, і кожны з актыўных змагароў тайком прымерваў на сябе дырэктарскі «скіпетр». У выніку доўгае вайны «зваліць» дырэктара ўдалося, але райана, якое бачыла ўсю тую мала-прыемную і недастойную тузаніну, паступіла хітра і, на мой погляд, мудра, па прынцыпе: ні нашым, ні вашым. Прызначыла ў школу новага дырэктара, зусім пабочнага чалавека. І калектыў супакоіўся.

Многія, на жаль, ня лепшыя традыцыі старой школы перадаліся і сёньняшняй, якая, ці ж ня сумна, з кожным годам становіцца ўсё болей педагагічна-імпатэнтнай. Дзеці абсалютна не жадаюць вучыцца. Хто хацеў, таго бацькі адправілі вучыцца ў горад. Астатнія ж ня толькі не жадаюць, а яшчэ й ня вельмі здольныя да вучобы. Што казаць, хапае ў нас праблемных сем'яў з неўладкаваным бытам і кволай маральнасьцю. Дзеці ня хочуць і ня могуць вучыцца, а настаўнікі ня вельмі сьпяшаюцца прыкласьці намаганьні, каб сітуацыю зьмяніць. Чым не рэвалюцыйная сітуацыя, характэрная, зрэшты, не для адной нашай школы. Вярхі ня могуць, нізы ня хочуць.

Зачыніцца ня сёньня-заўтра школа — і запануюць на яе месцы бур'ян і запусьценьне. І тое, што некалі зьбіралі землякі мае па цаглінцы, склаўшы ў прыгожы, сьветлы Храм навукі, які, нягледзячы ні на што, доўгія гады нёс народу асьвету, па цаглінцы ж мае землякі і расьцягнуць, пакінуўшы руіны і запусьценьне. Як мне гэтага ня хочацца! Кажуць, вёска жыве датуль, пакуль жыве ў ёй школа. Так і ёсьць. Каму з маладых захочацца адпраўляць дзяцей вучыцца за блізкі сьвет?

Якая б ні была ў нас сёньня школа, але свая. І страціўшы яе заўтра, мы пахаваем вёску...

## Ці пазайздросьцяць мёртвыя жывым?

Сьмерць — ня толькі матэрыяльная субстанцыя. І падчас куды страшней сьмерць духоўная. І потым, хто сказаў, што паміраюць толькі жывыя істоты? Я прыгадваў ужо, што ў нас за апошнія гадоў трыццаць вымерла паўвёскі. Але людзі есьць людзі. Іх пахавалі і, як ні цяжка прызнацца, пра іх, лічы, забыліся, бо яны ўжо «спарадкаваныя» — на сваім месцы, назаўсёды... Але ёсьць у маёй вёсцы і іншыя нябожчыкі, якія ва ўсіх на віду і на языках, бо ўжо колькі гадоў неспарадкаваныя. Адзін з такіх нябожчыкаў «жыве» і на нашай вуліцы. Гэта будынак былога нашага сельскага савету.

Помню, як яго будавалі... Я ўвогуле – доўгажыхар, памятаю яшчэ стары наш сельсавет, у звычайнай драўлянай хаце, хібак крыху даўжэйшай. Затое ж у хаце той мірна суседнічалі тры ўстановы: пошта, клуб з бібліятэкаю і сельсавет. Маню, тут жа, у маленькай баковачцы, месьцілася яшчэ і кінаўстаноўка, і па вечарах у нашым колішнім надзвычай цесным клубе зьбіраліся гледачы, тут круцілі кіно, а сельсавет уяўляў сабою пакойчык плошчаю метраў дваццаць квадратных, аніяк ня болей, дзе якраз памяшчаліся чатыры службовыя сталы: старшыні, сакратара, бухгалтара і «начуса» (начальнік уліковага стала), і яшчэ, за печкаю — мой «офіс». Тут стаяла кушэтка і трыножак, на які можна было пакласьці ліст паперы. Вось і ўвесь інтэр'ер майго першага (мо і апошняга) ў жыцьці «офісу». Мне ад трох да шасьці. Бацька вядзе мяне на шаліку на працу за сабою, як сабачанё, і на ўвесь дзень — у закабай. Садку тады ў нас не было. Ліст паперы мне ў рукі, і пакуль бацька-сакратар працірае штаны, закапаўшыся ў паперках, я малюю. Малюю хаты, дрэвы, дарогі, пішу што хачу. Я ніколі ў жыцьці ня быў такім вольным, як у тым драўляным нашым сельсавеце, за печкаю майго дзяцінства. Калі надакучыць у таты, бягу ў школу да мамкі. Тут блізка, адно што па дарозе расьце вялізарная ліпіна, у якой жыве страшны вецер, і я баюся, каб вецер не зламаў ды не паваліў ліпу мне на галаву...

А неўзабаве, бадай, побач з тым драўляным старым сельсаветам пачалі будаваць новы — цагляны, вялізны, а прыгожы! Гэта для мяне, малога, была казка. І рос ён хутка, як у казцы. І хоць для мяне ўжо там «офіс» ня быў прадугледжаны, бо я на той час пайшоў вучыцца ў школу, затое бацька мой у новым сельсавеце раскашаваў — ён меў асобны кабінет, і я заходзіў туды, як у сьвятліцу. Дзіва што сьвятліца. Мала таго, што ўсе сталы-суседзі па старым сельсавеце разышліся па асобных кабінетах, мала таго, што ў сельсавецкім холе можна было танцаваць — гэткі быў вялікі, дык яшчэ большаю была зала паседжаньняў (у якую за кампанію пусьцілі і бібліятэку). А пазьней, калі ўжо бацькі ня стала, да сельсавету прыбудавалі яшчэ адзін корпус, дзе разьмясьцілася зала рэгістрацыі шлюбаў. І, бадай, тут жа наш сельсавет... зачынілі за непатрэбнасьцю. У нейчую хворую галаву прыйшла вар'яцкая ідэя аб'яднаньня сельсаветаў. Спачатку мы апынуліся пад патранажам суседняга, ня вельмі далёкага ад нас. А ў хуткім часе цэнтр стане аж у Лепелі, а вёска нашая — на глыбокай перыферыі. Ня ведаю, што сэканоміла дзяржава на такой вось ракіроўцы, толькі не дзяржаўныя грошы. Бо грошы, укладзеныя ў капітальнае будаўніцтва такога шыкоўнага будынку, пайшлі, выбачайце, кату пад хвост. Не кажу пра тое, што і людзям ня стала весялей жыць на перыферыі. Тое, што пасьля закрыцьця адбылося з будынкам нашага сельсавету, пахне нафталінам і савецкімі падручнікамі па грамадзянскай абароне. На нейкі час там яшчэ затрымаліся пошта і бібліятэка, пакуль не пацёк дах. Зацьвілі-забуялі кніжкі, печ,

якую пабудавалі, каб неяк высушыць кніжкі (а раней жа было паравое ацяпленьне, якое адключылі, калі ня стала сельсавету), зразумелая рэч, тут жа разваліласяад вільгаці, і бібліятэка ўцякла. Пошта трымалася да апошняга. Бедная паштарка выходзіла на працу і ня ведала, за што хапацца: ці ліквідоўваць «сусьветны патоп» пасьля чарговага дажджу, каб не паплылі паперы і дакументы, ці падмазваць печку, якая расьцякалася на вачах, ці раскрываць парасон, абуваць гумавыя боты ды выконваць свае службовыя абавязкі. Нарэшце ня вытрымала, зьехала адтуль і пошта. Адзін час будынак меціла ўзяць у арэнду наша сортастанцыя (калі ён яшчэ быў жывы), але розныя ведамствы так і не змаглі між сабою дамовіцца наконт памеру арэнды. Правільна: і сам ня гам, і другім ня дам. Хай лепей гніе. Зараз у нашым былым сельсавеце можна хіба што здымаць фільм які ваенны, напрыклад, «Руіны страляюць ва ўпор», альбо якую фантастыку кшталту гогалеўскага «Вія». На вільчыку ганку тут вырасьлі маладыя дрэўцы, і ён вось-вось абваліцца, добра, калі не на чыюсьці галаву, бо дзеці, вяртаючыся са школы, часам забягаюць туды пасмаліць цыгарэтку, папіць піўка, а то і, выбачайце, справіць, пільную патрэбу. А ўлетку «сие заведение» як нельга лепей падыходзіць для аматараў экстрэмальнага сексу. Хаця што там рабіць без рэспіратару, ня ведаю. Ну, ды людзі розныя, і густы розныя. Такая вось невясёлая гісторыя. Зрэшты, гэтакіх каменных нябожчыкаў у нашай вёсцы вось ужо тры: жывымі трупамі сталі яшчэ лазьня і пральня. Хто наступны на могілкі? Напэўна, школа. Пакуль трымаецца яшчэ ФАП, які, хоць і старэнькі, драўляны, ды новая дбайная гаспадыня навяла там ідэальны парадак, самахоць зрабіўшы хай касьметычны, але рамонт. Трымаецца пакуль і крама. Сёлета нават, якая муха ўкусіла, падладзілі яго, інтэр'ер памянялі. Іронія мая зусім не беспадстаўная, бо крама нашая ня бачыла сур'ёзнага рамонту колькі сябе помніць, і ня бачыць бы далей як сваіх вушэй, ды мусіць, дапамаглі злодзеі, якія пачалі лазіць туды, пальцам раму аконную ўкалупнуўшы. Вось тады і спахапіліся. Крама нашая, як, зрэшты, і іншыя вясковыя, для багатых. Зразумелая рэч, у вёсках жа адны багацеі жывуць, а дабрабыт усё расьце і расьце... Параўнайце кошт многіх тавараў у Менску з цэньнікамі ў вясковых крамах, і сумненьняў у вас, дзе жывуць багацеі, не застанецца... Эх, у калгасе добра жыць: адзін робіць, сем ляжыць, а як трохі прыпячэ, дык і гэты ўцячэ... Маніць ня буду, у краме нашай камунізм. Усё па Марксу. Хто вывучаў навуковы камунізм, той памятае: «материальные блага польются рекою изобилия» и «денег не будет». Усё так і ёсьць: Ляжаць кілбасы адна другое прыгажэй, ад «дваццаткі» за кіло і болей. Апельсіны, мандарыны, бананы ў вёсцы. Афрыка! Праўда, хлеба, калі не дапільнуеш, можа не хапіць. Людзі зажраліся: хлеб у краме не заўсёды своечасова разьбіраюць. А назад хлеб чэрствы, як тое было раней, не прымаюць у прадаўцоў. Не прадалі — ешце самі. Бедныя жанчыны прадаўшчыцы, якія пільнуюць прылавак з ранку да вечару, а пад час уборачнай ці пасяўной дзяжураць у краме і цёмначы, за якія паўтары-дзве сотні тысячаў рублёў. Ці ж могуць яны кожнага разу насіць мяхамі дадому зялёны плесьневы хлеб сьвіньням, заплаціўшы за яго са сваёй кішэні. Вось і заказваюць хлеб цот у цот. Іх можна зразумець...

Ці пазайздросьцяць мёртвыя жывым?.. Невясёлыя справы на людскіх могілках. Хто там сказаў, што прыканцы сьвету жывыя будуць зайздросьціць нябожчыкам? Не, у нас пакуль яшчэ не канец сьвету, бо ў нас нябожчыкі моцна жывым зайздросьцяць. Мяркуйце самі, могілкі нашыя, дзе хавае людзей яшчэ некалькі вёсак, даўно ўжо сталі мегаполісам. Самі могілкі — лясісты курган сярод чыстага поля. Поле належыць суседняй гаспадарцы і яго то ўзаруць, то засеюць, не пусьціўшы нават сьцежкі, як сёлета, каб нябожчыка да магілы давезьці. Як яшчэ не засеюць і самі могілкі, вось бы ўраджай сабралі! А часам пакідаюць поле «гуляць», і тады там пасуцца каровы, цяляты. Вякамі неабгароджаныя клады нашыя вабяць буйнарагатых. Са скрухаю чытаюць каровы з цялятамі надмагільныя над-

пісы, плачуць над чорнымі жалобнымі істужкамі, а заадно не прамінуць і саскубсьціпрапалоць травіцу на магілках. Балазе, травіцы тут хапае і буралому таксама. Ніхто з імі не змагаецца, апрача сваякоў нябожчыкаў раз у год, на Радаўніцу. Колькі ўжо просяць нашага сельсавецкага старшыню дапамагчы ачалавечыць могілкі. Усяго і трэба, што абгарадзіць іх ды бульдозерам параўняць спуск да поля, каб пахаваньні паволі сыходзілі з узгорку. Бо ўжо ім настолькі цесна на старых кладах, што людзей хаваюць адзін на адным, а знайсьці тут вольнае месца — праблема. Бедныя, бедныя нябожчыкі... Як тут не пазайздросьціш жывым, у якіх вунь колькі прасторы, а ўсё ім мала, што нават у мёртвых кавалак гатовы адхапіць. Колькі ні прасілі вяскоўцы старшыню дапамагчы — ніякога выніку. Грошай у яго, бачыце, няма, а ў сельсавеце вунь сорак пяць вёсак. А цяпер у яго яшчэ і новая адгаворка: аграгарадкі будаваць трэба. То чаму ж нашая бесталковая неаграгарадковая вёска ня першая, а апошняя з сарака пяці? Пытаюцца жывыя, зьдзіўляюцца, паціскаючы плячыма, нябожчыкі. Ну, няўжо ж ім з магілаў падымацца ды самім выходзіць на сьвята камуністычнае працы? Іх гэтулькі бяз справы ляжыць, цэлы легіён час марнуе, маладыя ды здаровыя, вось дзе рэальная дапамога мясцовым уладам, і грошай плаціць ня трэба. Калі жывыя ўжо не спраўляюцца спарадкаваць вёску, магчыма, ім нябожчыкі дапамогуць? Ды і хто тут, у вёсцы, жывы застаўся?!

Хаця ня буду ўжо такім гарлапанам-крытыканам. Зрабілі нашыя ўлады на могілках добрую справу, зрабілі: скрынкі для сьмецьця паставілі... бяз дна. Стаялі тыя скрынкі стаялі, думалі-думалі, якім чынам у іх сьмецьце кідаць будуць, ды так і не дадумаліся, згнілі і разваліліся. Зрэшты, справу добрую зрабілі нашыя ўлады і ў вёсцы: запалілі ліхтары, акурат пад чарговыя выбары, ці то рэферэндум, відаць, каб народ бачыў цёмны сьцежкі-дарогі да свайго правільнага волевыяўленьня. А неўзабаве пасьля волевыяўленьня ліхтары тыя патухлі. Мусіць, дзеля эканоміі народных сродкаў, бо да новых выбараў далёка яшчэ, а народу і так нармальна. Пакуль ня ўшчухаліся нашыя бабулькі, актывісткі мясцовыя, за што ж тады яны, выходзіць, галасавалі, калі не за сьветлае заўтра? Ліхтары засьвяціліся зноў. Шкада, што не на нашай вуліцы. Нам так ніводнага ліхтара і не дасталася. Лагічна. Разумна. Якая карысьць на нас дзяржаўныя грошыкі пераводзіць, мы, «сьвядомыя», сваё волевыяўленьне і ў прыцемках адшукаем.

Любім мы, вяскоўцы, залатую перадвыбарчую часіну. І ліхтары гараць, і калонкі водаправодныя працуюць — чым ня рай!..

Вось так і жывем. Жывыя пацяшаюцца з нябожчыкаў, а мёртвыя з жывых пацьвельваюцца. Як сказаў класік, з мінулым разьвітваемся сьмеючыся. Жарты жартамі, але неўсур'ёз хіба пабудуеш будучыню?..

## «Я азёрную сінечу вуснамі лаўлю...»

Я не пустэльнік... А зрэшты, ня буду так катэгарычна. Пустэльніцтва ёсьць стан душы, а душы не загадаеш... Напэўна, ніводзін пустэльнік у сьвеце не адважыцца прызнацца сабе, што ён... Вось ён і ёсьць... Бо гэта вельмі страшна...

Але ж калі вакол цябе няма людзей, якіх ты хочаш бачыць, якія, адчуваеш, патрэбныя табе — то пачынаеш паціху вар'яцець. А з людзьмі малазнаёмымі, чужаватымі адчуваеш сябе хваравіта-няёмка, некамфортна, пазьбягаеш шумлівых і тлумных, вясёлых і клопатных людскіх тусовак і масовак, уцякаеш, прагнеш адзіноцтва. Што гэта, калі не пустэльніцтва?

Тэорыя вар'ята. Я часам мадэлюю сітуацыю: вось калі б тут, дзе вякуеш свой век, не аказалася раптам ні вёскі тваёй, ні сяброў, ні блізкіх, ні знаёмых — нікога! А былі б толькі Хата, Возера і Пагост. Ці застаўся б ты тут? Ці пакінула б цябе душэўная раўнавага? На першае пытаньне адказваю: ТАК. На другое — НЕ. Ці ж гэта не пустэльніцтва?!

Быць у суладдзі з сабою, стаміўшыся ад шумнага жыцьця, мне дапамагае возера.

Возера нашае невялічкае, летам цёплае, дамашняе. У часіны старажытныя, пэўна, рэчка цякла, перасохла, і застаўся кавалак люстраное гладзі з паўвярсты ўшыркі і вярсту даўжынёю. Помню возера свайго дзяцінства, дзівосна чыстае, здаровае. З таткам ідзем, па чыстым лядку, яшчэ не прысыпаным сьнегам. Трашчыць, а не пускае, а пад празрыстым шкельцам ільду — усё царства падводнае, як на далоні: рыбкі плаваюць, водарасьці зьвіваюцца, жоўты плывун на дне...

Спакой нашага возера парушалі неаднойчы, а то можа б, і сёньня берагі яго былі ў жоўтым пясочку, як раней, а не ў густых балацяных чаратах. Добра было з вудачкай пасядзець на беразе возера летнім ранкам, раз-пораз выцягваючы з малочнага туману, што густа слаўся над вадою, спрытных, ладных плотачак, гусцёрачак, акунькоў, калі пашанцуе, можна было злавіць падлешчыка ці карпа. Рыбы ў возеры нашым было поўна заўсёды. Толькі з вудачкай хадзілі хіба аматары-рыбакі. Спрытнюгі ж, якія былі ўпэўненыя, што сьвет створаны дзеля іх узбагачэньня, на дробязі не разьменьваліся, цягаліся па возеры поначы з сеткамі. Хапала рыбы і сабе, і сваякам, і на продаж, і даць каму трэба, каб іх не турбавалі. Усе ведалі пра гэта і ўсе маўчалі. А куды рыпнешся, калі браканьерствавала мясцовая “эліта”, у якой усё было схоплена. Дванаццацігадовым хлапчуком я напісаў неабыякавы верш, у якім зьедліва высьмейваў нашых браканьераў. Хацеў нават паслаць яго ў газету, але бацька ўзбунтаваўся:

— Ты што, сынок! Заклююць...

Я, малы, яшчэ не зусім разумеў, як гэта людзі клююцца, але бацькі паслухаўся. І заклявалі б, без сумневу, бо ў каго правы, у таго і праўда.

Аднойчы ў восень, ці не ў канцы сямідзясятых, рыба ў нашым возеры раптам пачала ўсплываць кверху плаўнікамі, і хвалямі яе прыбівала да берагоў. Берагі былі спрэс усланыя рыбаю. Народ кінуўся да возера, зьбіраў яе ў мяхі і скормліваў сьвіньням. Во дзе сьвіньні паласаваліся! Аказалася, выцекла бочка з аміяком, якая стаяла на гары, над возерам. Рыба патруцілася і гадоў дваццаць ніяк не магла агоўтацца, узнавіцца. А тут яшчэ пастараліся меліяратары: асушылі прыазер'е, парабілі каналы, ды так заўзята, што ў возера трапіла балотная вада, а рэчачцы, невялікай, бадай, раўчуку, адзінай, якая выносіла, мяняла ваду ў возеры, перагарадзілі дарогу. Змагалася возера змагалася за жыцьцё, урэшце ўсё ж вада прабіла сабе дарогу, але пакуль прабіла, пасьпела застаяцца, забалацець. Павольна, паступова вярталася возера да жыцьця, дый людзі ня спалі ў шапку. Паявілася мода “лавіць” рыбу электравудачкамі. Ня столькі налавіліся, колькі бяды нарабілі. І рыба, якая пачала ўжо была ўзнаўляцца, напужаўшыся, застрайкавала і ня стала больш падыходзіць да берагоў. Рыба перастала верыць чалавеку. Цяпер сядзі ты сабе з вудачкай на беразе хоць гадзіну, хоць дзьве, хоць дзень цэлы, а багатага ўлову, такога, як раней, не дачакаешся. Людзі чаго толькі не прыдумваюць: і кладкі трывалыя пабудавалі на балацяных берагах, і вуды доўгія набылі, каб аж на сярэдзіну возера закідваць, і закормліваюць тую рыбу, як дбайная гаспадыня кормнага парсюка, а рыба ўсё працягвае выказваць чалавеку, які ўжо неаднойчы падмануў яе, свой нямы пратэст.

Ці толькі рыба — пратэстуе ўсё возера, з кожным годам усё болей зарастаючы аерам ды чаратамі, пакрываючыся балацянаю цінаю, зацьвітаючы жоўтымі гарлачыкамі. Гарлачыкі — зьвестуны бяды. Іх жоўты колер — колер разьвітаньня, расстані. Няўжо калі ня нам, то нашым нашчадкам давядзецца зьбіраць тут, у азёрнай пойме, журавіны і разьвітацца з возерам назаўсёды? Зьбіраць ягады адчаю там, дзе дзяды і прадзеды купаліся ў халодных ласкавых хвалях...

Люблю паплаваць уначы, асабліва калі ноч цёплая ліпеньская, калі зоркі гля-

дзяцца ў ваду і пераліваюцца, блішчаць у ёй безьліччу маленькіх яркіх ліхтарыкаў-сьветлячкоў. Калі ня толькі цела, але і душа раствараецца ў прыродзе, зьліваючыся з ёю ў адзінае непадзельнае. І кожны раз, кідаючыся ў цёплыя, пяшчотныя абдымкі начнога возера, я пытаюся, ці хопіць у яго цярпеньня, калі хопіць, то на колькі пакаленьняў нас, неразумных, дзікіх, грэшных і няшчасных, што па-глупству свайму і недаразьвітасьці ўзьвялі сябе вяршыняю прыроды. Маўчыць маё возера, не адказвае, мусіць, ведае яно таямніцу нейкую вялікую, якую нам, людзям, ня дадзена спасьцігнуць.

Што ў маўчаньні тваім, прырода! Што ў трызьненьні тваім, чалавек!